Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна

№ 19 (364) | Панядзелак, 11 МАЯ 1959 года | Цана 20 кап.

## ДЗЕНЬ ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ

14 гадоў назад адгрымелі на руінах Еўропы апошнія выстралы другой сусветнай вайны. Савецкая Армія нанесла сакрушальны ўдар ворагу, і настаў доўгачаканы Дзень Перамогі. Яго чакалі савецкія людзі, яго чакалі сотні мільёнаў простых людзей свету, якіх імкнуўся заняволіць германскі фашызм. Для нашага народа гэты дзень стаў вялікім святам.

Апошняя вайна была самай цяжкай з усіх войнаў, якія прыходзілася калі-небудзь весці нашаму народу за сваю незалежнасць. Яна прынесла многа нягод і разбурэнняў не толькі нашай краіне. У гэтай вайне было разбурана мноства гарадоў і вёсак Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы, загублены мільёны чалавечых жыццяў.

У гэтай вайне вырашаўся лёс першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы. У гісторыі чалавецтва не было роўных таму подзвігу і мужнасці, якія праявілі савецкія людзі, адстойваючы сваю Айчыну. Магутнай сцяной яны стаялі супроць ворага.

Кожны дзень Вялікай Айчыннай вайны—гэта неўміручая старонка летапісу масавага гераізму савецкага народа. Колькі геройскіх подзвігаў зрабілі савецкія людзі на фронце і ў тыле. Бітвы пад Масквой і Ленінградам, Курскам і Белгарадам, абарона Адэсы і Севастопаля—вось прыклады бясстрашнасці і вялікай мужнасці савецкіх воінаў у дні вайны. Як многа слаўных імёнаў вылучылі камсамол, савецкая моладзь! Заўсёды застануцца ў нашай памяці неўміручыя подзвігі Аляксандра Матросава, Мікалая Гастэлы, Юрыя Смірнова, Лізы Чайкінай.

За гераізм і адвагу ў дні Вялікай Айчыннай вайны звыш 3,5 мільёна камсамольцаў узнагароджаны ордэнамі і медалямі. Тысячы іх удастоены высокага звання Героя Савецкага Саюза.

Прыклады гераізму і стойкасці ў дні вайны праявіў беларускі народ, яго слаўныя воіны. Наш край быў краем класічнай партызанскай барацьбы. Народныя мсціўцы смела ішлі на разгром варожых гарнізонаў, камунікацый. Яны былі вялікімі майстрамі вядзення «рэйкавай вайны». Вечна будуць жыць у сэрцах беларускай моладзі гераічныя справы обальскіх падпольшчыкаў, камсамольцаў Скідзеля, маладагвардзейцаў Жлобіна.

У дзень вялікай перамогі, мы ўшаноўваем памяць аб сваіх сынах і дочках, загінуўшых у баях за Радзіму, горача вітаем воінаў доблесных Савецкіх Узброеных Сіл—надзейных абаронцаў вялікіх заваёў Кастрычніка.

Савецкія людзі адзінадушны ў сваім імкненні адстаяць і ўмацаваць справу міру. Будуючы новыя прамысловыя цэнтры, паднімаючы цаліну, ствараючы спутнікі, наш народ працуе ў імя міру. Савецкая сямігодка з'яўляецца гіганцкім крокам па шляху недапушчэння вайны, яркім доказам міралюбівай знешняй палітыкі Савецкай дзяржавы.

## Новы вучэбны план журналістаў

Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР з удзелам прадстаўнікоў Маскоўскага, Ленінградскага, Уральскага, Кіеўскага, Беларускага і Казахскага універсітэтаў распрацавала праект новага вучэбнага плана па спецыяльнасці «журналістыка».

План зыходзіць з таго, што на першы курс прымаюцца асобы, якія ўжо маюць працоўны стаж, таму студэнты і на першых двух курсах вучацца з адрывам ад вытворчасці. У астатнім праект карэнным чынам адрозніваецца ад цяперашняга дзейнічаючага плана.

Заняткі па спецыяльных (прафілёвых) дысцыплінах пачынаюцца з 1-га курса.

На вытворчую практыку адводзіцца 46 тыдняў (было 12—16 тыдняў). На працягу ўсяго 6-га і 8-га семестраў студэнты будуць працаваць у рэдакцыях газет, часопісаў, выдавецтваў, радыёвяшчання і тэлебачання, а вучобу праходзіць на завочнай і вячэрняй сістэме.

Вучэбная практыка па спецыялізацыі (арганізацыя выпуску вучэбнай газеты, набор, карэктура, арганізацыя вучэбных радыё- і тэлеперадач і інш.) запланавана на кожным курсе ад 2-х до 6-ці гадзін у тыдзень, усяго 296 гадзін.

Машынапіс, стэнаграфія і фотасправа з'яўляюцца абавязковымі дысцыплінамі. Яны вывучаюцца ў першыя два гады, а ў наступныя гады студэнты самастойна ўдасканальваюць свае веды па гэтых дапаможных дысцыплінах.

Прадугледжаны новыя віды спецыялізацыі. Рыхтуючы ў асноўным кадры для рэдакцый раённых і іншых газет, аддзяленне журналістыкі павінна таксама забяспечыць навучанне асобных, няхай невялікіх, груп студэнтаў, для работы ў галіне радыёвяшчання і тэлебачання, а таксама ў кніжных выдавецтвах. З гэтай мэтай уводзяцца спецыяльныя курсы і семінары: «рэдактар масавай літаратуры», «літаратурны работнік радыёвяшчання», «літаратурны работнік тэлебачання» і іншыя.

Як па існуючым, так і па новым плане вывучаюцца асновы эканомікі прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Без ведаў эканомікі немагчыма цяпер плённая работа ў рэдакцыях газет.

Пры распрацоўцы праекта асабліва падкрэслівалася, што пры ўсім вялікім значэнні вытворчай практыкі, тэарэтычная вучоба ні ў якім разе не павінна быць зніжана. Наадварот, значэнне і якасць лекцый неабходна яшчэ больш павысіць—дабівацца таго, каб яны сапраўды ўзбагачалі студэнтаў грунтоўнымі ведамі па вывучаемых дысцыплінах.

Завяршаецца вучоба абаронай дыпломнай работы і дзяржаўнымі экзаменамі па гісторыі КПСС і журналістыцы. Разам з цяперашнімі прапануемымі тэмамі дапускаецца і новы тып дыпломнай работы. Асобным, найбольш падрыхтаваным студэнтам, якія апраўдалі сябе ў рэдакцыях газет, кафедрай можа быць дазволена прадстаўленне ў якасці дыпломнага сачынення серыі нарысаў, фельетонаў, артыкулаў і карэспандэнцый, якія напісаны ў 8—10 семестрах і апублікаваных ў друку. Каштоўнасць такой дыпломнай работы відавочная: яна можа з'явіцца толькі як вынік вялікай самастойнай, **творчай** працы па вывучэнню (даследаванню) жыццёвага матэрыялу, як вынік сувязі і цесных адносін з людзьмі, з перадавікамі прамысловых прадпрыемстваў і калгасаў, з лепшымі прадстаўнікамі савецкай інтэлігенцыі.

Ажыццяўленне новага вучэбнага плана будзе садзейнічаць таму, што выпускнікі аддзялення журналістыкі ўжо ў сценах універсітэта значна лепш, чым цяпер, будуць падрыхтаваны да самастойнай работы ў друку.

**М. С. ЗЯРНІЦКІ, заг. кафедры тэорыі і практыкі партыйна-савецкага друку.**

## Вынікі агляду факультэцкіх насценных газет

Гэтымі днямі адбылося пасяджэнне камісіі па праведзенню агляду насценных газет факультэтаў.

Камісія вырашыла:

1) Присудзіць першае месца і першую прэмію ў суме 250 рублёў газеце біялагічнага факультэта «За мічурынскую біялогію» (рэдактар М. Гесь).

2) Другое месца і дзве другія прэміі па 150 рублёў прысудзіць газетам філалагічнага факультэта «Слова філолага» (рэдактар газеты Д. Фактаровіч) і юрыдычнага факультэта «Савецкі юрыст» (рэдактар В. Сіўцоў).

3) Дзве трэція прэміі і трэцяе месца вызначыць газетам геаграфічнага факультэта «Географ» (рэдактар А. Русіновіч) і сатырычнай газеце філалагічнага факультэта «Джала» (рэдактар А. Залескі).

4) Узнагародзіць Ганаровай граматай газету «За мічурынскую біялогію» і граматамі рэктарата насценгазеты «Патрыёт», «Студэнт гістфака», «За навуку» і газеты, якія занялі першае, другое і трэцяе месцы.

5) За актыўную работу ў насценным друку ўзнагародзіць Ганаровай граматай рэктарата рэдактара газеты «За мічурынскую біялогію» М. Д. Геся і намесніка рэдактара В. І. Міхалкова.

## *Заслужаны адпачынак*

Нядаўна калектыў выдавецтва і друкарні універсітэта праводзіў на пенсію старэйшага рабочага, друкара Залмана Маісеевіча Кофмана.

Свой працоўны шлях З. М. Кофман пачаў з 1914 года. Ён прайшоў вялікі жыццёвы шлях. Пачынаючы з 1920 года, ён няспынна працаваў у паліграфічнай прамысловасці і стаў кваліфікаваным майстрам сваёй справы. У 1930 годзе Залман Маісеевіч уступіў у члены КПСС. Супрацоўнікі выдавецтва і друкарні пажадалі т. Кофману добрага здароўя і доўгіх год жыцця.

## Студэнты універсітэта на першамайскай дэманстрацыі





Фота А. ДАШУКА.

## ВІНШАВАННІ ВНУ КРАІНЫ

У сувязі з Міжнародным святам — Днём Першага Мая ў адрас нашага універсітэта паступілі віншаванні ад калектываў Томскага палітэхнічнага інстытута, Мінскага Палітэхнічнага інстытута, Вільнюскага, Кіеўскага, Ленінградскага, Маскоўскага, Далёкаўсходняга і Харкаўскага універсітэтаў, а таксама ад экіпажа падшэфнага баявога карабля.

